Не менш важнае значэнне ў кнізе надаецца і высвятленню пытання аб узаемаадносінах шляхты з царквой. Аўтар імкнецца паказаць гэту праблему як своеасаблівы шляхецкі выбар паміж палітыкай, кар’ерай і касцёлам, а ў рэальным жыцці – як суадносіны нябеснага і зямнога.

Праз усю працу праходзіць думка аб дыхатамічным, дыялектычным і нават бінарным становішчы шляхты, якая быццам бы пастаянна знаходзіцца перад выбарам – здрадзіць Айчыне або самой сабе і ўласнаму роду. Тут адчуваецца моцны ўплыў сутнаснай ролі мемуарнай літаратуры – праз пэўную рэфлексію зрабіць працу над памылкамі і што трэба было б здзейсніць, каб змяніць гістарычны працэс. Манаграфія істотна пашырае нашы веды аб пануючым саслоўі Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст., улічваючы, што ў ёй прысутнічае і беларускі матэрыял, яна будзе карыснай для ўсіх, хто вывучае і цікавіцца айчыннай гісторыяй.

***С. А. Захаркевіч,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
***Ю. Л. Казакоў,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

П. І. Зялінскі, У. К. Коршук, У. Ф. Ладысеў. **Гісторыя Беларусі (1917–1945):** дапаможнік. Мінск: БДУ, 2012. 271 с.

Вучэбна-метадычны дапаможнік «Гісторыя Беларусі (1917–1945)», аўтары якога – вядомыя навукоўцы, ахоплівае падзеі гісторыі Беларусі 1917–1945 гг. Менавіта гэты перыяд беларускай гісторыі адзначаны глыбіннымі ўзрушэннямі, дзвюма рэвалюцыямі і дзвюма сусветнымі войнамі.

Адной з вызначальных асаблівасцей гісторыі Беларусі гэтага перыяду з’яўляецца непарыўная сувязь з гістарычнымі лёсамі рускага народа і іншымі народамі былой Расійскай імперыі. Таму правамерна, што ўсе лёсавызначальныя праблемы грамадска-палітычнага жыцця і нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі аўтары дапаможніка разглядаюць з улікам дасягненняў айчыннай гістарыяграфіі, а таксама найноўшых распрацовак зарубежных і перш за ўсё расійскіх і польскіх вучоных.

Рэцэнзуемая кніга складаецца з чатырох раздзелаў (тэм). Усе яны напісаны на аснове творчага выкарыстання гістарыяграфічных і крыніцазнаўчых здабыткаў, у выніку чаго кніга ўяўляе сабой гістарычнае даследаванне новага пакалення. У ім паглыблена разгледжаны многія ранейшыя пытанні, асветлены больш грунтоўна, з увядзеннем ва ўжытак дыскусійнага праблемнага матэрыялу аб беларускім нацыянальным руху, аб дзейнасці БНР і інш. Усё гэта, безумоўна, будзе садзейнічаць павышэнню зацікаўленасці студэнтаў да вывучэння айчыннай гісторыі.

У першым раздзеле «1917 год у Беларусі. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці» на базе асноватворных прынцыпаў гістарызму і аб’ектыўнасці аналізуецца становішча Беларусі ў час Лютаўскай рэвалюцыі, якая падвяла рысу пад шматвяковай гісторыяй расійскай манархіі і адкрыла шлях да дэмакратычнага развіцця народаў Расіі. Змястоўна і цікава чытаюцца старонкі аб альтэрнатывах грамадскага развіцця пасля падзення царызму і ўтварэння новых органаў улады Саветаў, аб уздыме беларускага нацыянальнага руху ў сакавіку – кастрычніку 1917 г.

Усебакова і глыбока адлюстраваны падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўстанаўленне савецкай улады на Беларусі. У гэтым раздзеле падкрэслена значэнне ў лёсе нашага народа стварэння Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы Беларусі (ССРБ) і робіцца дакладная высновa, што, «нягледзячы на тэрытарыяльныя страты ў гады Грамадзянскай вайны і знешняй інтэрвенцыі, была ўтворана і прызнана дэ-юрэ беларуская нацыянальная дзяржаўнасць» (с. 73).

У другім раздзеле «Беларуская ССР у 1920–30-я гг.» дэталёва і навукова абгрунтавана разгледжаны пытанні дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі ў 1921–1927 гг. Значнае месца ўдзелена сутнасці новай эканамічнай палітыкі і асаблівасцям яе ажыццяўлення ў Беларусі, станаўленню беларускай савецкай сістэмы адукацыі і навукі. Падкрэслена значэнне вяртання рэспубліцы ў 1924 і 1926 гг. усходнебеларускіх тэрыторый, якія раней па ваенна-палітычных меркаваннях былі перададзены РСФСР.

На працягу 1930-х гг. у Беларускай ССР, як і ва ўсёй савецкай дзяржаве, была ўсталявана таталітарная сістэма праўлення. У дапаможніку слушна адзначана, што ўжо ў сярэдзіне 1920-х гг. у СССР ішла вострая ўнутрыпалітычная барацьба за выбар далейшага шляху развіцця краіны. У гэтай барацьбе атрымала перамогу дактрына І. Сталіна аб фарсіраванай пабудове сацыялізму ў СССР ва ўмовах капіталістычнага акружэння. Яна імкнулася ліквідаваць многаўкладнасць у эканоміцы і рынкавых адносінах, правесці паскораную індустрыялізацыю, калектывізацыю, культурную рэвалюцыю, умацаванне палітычнай сістэмы. Гэта было дапоўнена шырокамаштабнымі, неабгрунтаванымі палітычнымі рэпрэсіямі сярод усіх пластоў насельніцтва – сялян, рабочых, служачых, інтэлігенцыі.

Умацаванне таталітарнага рэжыму ўплывала на развіццё асветы і навукі, літаратуры і мастацтва, становішча рэлігіі. Раскрываючы гэтыя сюжэты, аўтары дапаможніка лагічна падводзяць чытача да высновы, што «развіццё культуры ў Беларусі ў 1930-я гг. прайшло складаны і супярэчлівы шлях. Былі ў гэты перыяд і значныя дасягненні і вялікія страты, звязаныя з усталяваннем таталітарнай сістэмы» (с. 168).

У трэцім раздзеле «Заходняя Беларусь у складзе Польшчы (1921–1929) змястоўна раскрываецца, як польскія ўлады праводзілі на гэтай тэрыторыі, якую яны ў сваіх афіцыйных дакументах называлі «крэсы ўсходнія» (што азначала «ўсходнія ўскраіны» 2-й Рэчы Паспалітай), палітыку паланізацыі. Харак-

тарызуючы становішча прамысловасці і сельскай гаспадаркі краю, аўтары дапаможніка пераканаўча паказваюць, што галоўную ролю ў цяжкім эканамічным становішчы Заходняй Беларусі атрымалі канкрэтныя мерапрыемствы польскіх улад, якія разглядалі анексіраваныя землі як сыравінны прыдатак. Аналізуючы стан культуры Заходняй Беларусі, аўтары дапаможніка падводзяць студэнтаў да высновы, што, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, культурнае жыццё развівалася, паколькі заставаўся галоўны носьбіт нацыянальнай культуры – народ, што стваралі́ся вялікія культурныя каштоўнасці, якія з'яўляюцца арганічнай часткай агульнанацыянальнай культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі і Еўропы.

У апошнім, чацвёртым раздзеле «Беларусь у гады Другой сусветнай вайны (1939–1945)» дадзена сціслая, але дакладная характарыстыка міжнароднага становішча, а таксама аналіз эканамічнага, грамадска-палітычнага і духоўна-культурнага жыцця нашай краіны напярэдадні вайны. Усебакова асвятляецца становішча Беларусі ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны, абарончыя баі на яе тэрыторыі летам 1941 г. Глыбока паказана сутнасць устаноўленага нацысцкага акупацыйнага рэжыму і калабарацыянізму ў Беларусі. Асаблівая ўвага ўдзяляецца аўтарамі кнігі раскрыццю такіх праблем, як станаўленне і развіццё партызанскага руху і падпольнай барацьбы; баявая і дыверсійная дзейнасць партызан і падпольшчыкаў; узаемаадносіны партызан і мірнага насельніцтва Беларусі. Навізной матэрыялу і фундаментальнасцю вывадаў вызначаецца спецыяльны і самы аб'ёмны падраздзел аб вызваленні Беларусі ад захопнікаў і ўкладзе беларускага народа ў Вялікую Перамогу.

Як бачна са зместу рэцэнзуемага дапаможніка, у ходзе актыўнага ўдзелу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне гераічнае і трагічнае часта перапляталася. Трагічнае ўскладнялася тым, што на акупіраванай тэрыторыі асноўная частка насельніцтва змагалася з ворагам, а нязначная, асабліва незадаволеная бальшавіцкім рэжымам, супрацоўнічала з акупантамі, вяла барацьбу супраць савецкай улады. Гэта з'яўлялася адной з асаблівасцей гісторыі Беларусі ў гады ваеннага ліхалецця.

У дапаможніку чырвонай ліні́яй праводзіцца думка, што важнейшую ролю ў дасягненні Вялікай Перамогі адыграў Савецкі Саюз і што «шчытом, які прыкрыў краіну Саветаў у час вайны, была і Беларусь» (с. 262), што грамадзяне Беларусі на франтах вайны, у партызанскай і падпольнай барацьбе, у еўрапейскім Руху супраціўлення абаранялі не толькі сваю краіну, але і вызвалялі ад фашызму іншыя народы. «Беларускі народ, – падкрэслена ў дапаможніку, – як і абаронцы ўсёй савецкай краіны, гераічна змагаўся з акупантамі і выйшаў пераможцам».

Безумоўна, падрыхтаваны аўтарскім калектывам вядомых вучоных вучэбна-метадычны дапаможнік адпавядае адукацыйным крытэрыям і задачам выхавання студэнтаў гісторыі.

Разам з тым, станоўча ацэньваючы кнігу, хацелася б у якасці заўвагі (альбо пажаданняў на магчымае другое выданне) адзначыць наступнае.

Па-першае, па структуры кнігі. На наш погляд, выкладанне матэрыялу выйграла б пры больш раўнамерным і гарманічным размеркаванні яго па адпаведных 4 раздзелах (тэмах). Прычым несуразмернасць уласціва не толькі раздзелам, а і падраздзелам. Так, раздзел 2 уключае 9 падраздзелаў і складае 93 старонкі (с. 74–168), а раздзел 3 – адпаведна 4 падраздзелы і складае 30 старонак (с. 169–198).

Па-другое, адносна дакладнасці некаторых палажэнняў. Так, перыядызацыя гісторыі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы абмяжоўваецца 1921–1929 гг. (с. 169), а не 1921–1939 гг. Сумніўна лічыць крызіс 1921–1922 гг. таталітарным (с. 75). Мэтазгодней яго характарызаваць як сацыяльна-эканамічны, тым больш, што адносны дэмакратызм новай эканамічнай палітыкі з'яўляўся падставай для пазітыўных змен у жыцці грамадства як ва ўсёй савецкай краіне, так і ў Беларусі.

Па-трэцяе, пажадана ў наступным выданні дапаможніка даць абагульняючыя вывады па кожнаму з чатырох раздзелаў (тэм), а таксама зрабіць заключэнне па ўсёй кнізе, пашырыць спіс літаратуры, звярнуўшы асаблівую ўвагу на выданні апошніх гадоў.

Выказаныя заўвагі не зніжаюць у цэлым станоўчай ацэнкі вучэбнага дапаможніка, які вызначаецца канцэптуальнымі падыходамі аўтараў да асвятлення падзей і будзе трывалым падмуркам для далейшай паглыбленай самастойнай работы студэнтаў па вывучэнню айчыннай гісторыі.

***А. І. Котаў,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
***І. Ф. Раманоўскі,***
кандыдат гістарычных навук, прафесар